ДОБРАЯ КНІГА – ВЕЧНАЯ ІСЦІНА

# Літаратурная пара

Агляд падрыхтавала бібліятэкар аддзела абанемента абласной бібліятэкі імя Я. Карскага Анастасія ЮХНЕВІЧ.

**Культурнае жыццё Беларусі ў 2012 годзе праходзіць пад знакам 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Выходзіць вялікая колькасць новых выданняў, манаграфій і даследаванняў, прысвечаных творчасці сапраўдных волатаў беларускай літаратуры.**




Выдавецтва "Беларусь" прэзентавала **фотаальбом Анатоля Кляшчука "Беларусь. Зямля песняроў"**. Кніга падзяляецца на дзве часткі: Зямля Купалы і Зямля Коласа, кожная з якіх змяшчае здымкі знакавых месцаў.

Фотакарэспандэнт на працягу пяці гадоў бываў у мясцінах, дзе жылі і тварылі песняры. Ён шмат дзён правёў сярод узвышшаў Маладзечанскага, Мінскага і Лагойскага раёнаў, вандраваў па берагах Нёмана і Свіслачы менавіта ў тую пару, калі іх наведвалі Купала і Колас.

У альбоме таксама выкарыстаны архіўныя фотаздымкі з літаратурных музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Тэкст у кнізе напісаны на беларускай і англійскай мовах.




У выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў серыі "Жыццё знакамітых людзей Беларусі" выйшла **кніга "Янка Купала. "Мне сняцца сны аб Беларусі..."**. Аснову выдання склалі ўспаміны сучаснікаў паэта, яго родных і блізкіх, пісьменнікаў і навукоўцаў, дзеячаў мастацтва і культуры, кіраўнікоў і простых людзей, якія сустракаліся з Купалам. Першыя запісы датуюцца 1928 годам, апошнія – 2010-м.

Кніга складаецца з сямі раздзелаў, якія названы радкамі з вершаў Янкі Купалы: "Як на свет нарадзіўся Янка", "Для Бацькаўшчыны-маці буду іграць", "Стаім мы перад будучыняй нашай..." і інш.




Выдавецкі дом "Беларуская навука" выпусціў грунтоўную манаграфію **Міхаіла Тычыны "Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння"**.

Выданне цікавае тым, што творчасць паэтаў разглядаецца не паасобку, а ў сугучнасці. Тычына ўводзіць паняцці "літаратурнай пары" і "двайной зоркі". Дарэчы, у сусветнай гісторыі сімвалам нацыянальнай літаратуры часта станавіліся падвоеныя зорныя імёны: Гётэ і Шылер, Бальзак і Стэндаль, Пушкін і Гогаль, Шаўчэнка і Франко. На думку аўтара, у беларускай літаратуры творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа забяспечыла духоўнае адзінства ўсіх пакаленняў беларусаў і законнае месца беларускай літаратуры ў свеце нацыянальных літаратур.




"Мастацкая літаратура" таксама завершыла выданне **зборніка дакументаў і матэрыялаў "Купала і Колас, вы нас гадавалі"**, распачатае ў 2010 годзе. Шырокаму колу чытачоў прапанаваны невядомыя дакументы, у тым ліку аўтографы класікаў, сведчанні пра іх грамадскае і літаратурнае акружэнне, матэрыялы біяграфічнага характару. Друкуюцца дакументы пра святкаванне юбілеяў пісьменнікаў, увекавечанне іх памяці, стварэнне і дзейнасць музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа. У дадатку змешчаны дакументы за 1928–1944 гады, выяўленыя ўжо пасля таго, як рукапіс зборніка быў падрыхтаваны да друку.